*Мардань Дар‘я Анатольеўна,*
*педагог дадатковай адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі “Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Маяк” г.Мінска” ,*
*магістр мастацвазнаўства,*
*спецыяліст па фальклору, музыкант, даследчык*

# “Этнакультурнае выхаванне дзяцей і моладзі як сродак трансляцыі сямейных каштоўнасцей (на прыкладзе фальклорнага ансамбля «Млынок»”)

*У артыкуле разглядаецца практыка пераймання каляндарна-абрадавай песеннай традыцыі ў дзейнасці фальклорнага ансамбля ”Млынок” Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Маяк” г.Мінска. Апісваюцца рэпертуарныя асаблівасці фальклорнага ансамбля і спецыяльныя метады засваення навучэнцамі сямейных каштоўнасцей сродкамі народнай культуры.*

*Ключавыя словы: аўтэнтыка, традыцыйная культура, песенная культура, фальклорны ансамбль, этнакультурнае выхаванне.*

Этнакультурнае выхаванне дзяцей і моладзі з`яўляецца цэласным працэсам трансляцыі і засваення традыцыйнай культуры, культурных і сямейных каштоўнасцей, якія набываюць асаблівую актуальнасць ва ўмовах інфармацыйна-культурнай прасторы XXI стагоддзя. Мэта этнакультурнай адукацыі цесна звязана з працэсамі адраджэння нацыянальнай культуры, аднаўлення страчаных каштоўнасцей, гістарычнай памяці народа. Засваенне падрастаючым пакаленнем культурнай спадчыны сваіх продкаў, самабытнасці і непаўторнасці народных традыцый і звычаяў фарміруе нацыянальную самасвядомасць, пачуццё сваёй прыналежнасці да роднага народу, інтарэс да яго гісторыі і культуры, павагу да культуры іншых народаў. Асновы сямейных

каштоўнасцей і выхавання падрастаючага пакалення ў народнай культуры ўвайшлі ў паняцце ***этнапедагогіка*** . Яна абапіраецца на ядро нацыянальнай культуры; на ўзровень нацыянальнай самасвядомасці, праявы нацыянальнага характару, асаблівасці нацыянальнага менталітэту, а таксама на «наяўнасць нацыянальных ідэалаў выхавання». Этнапедагогіка з'яўляецца неабходнай часткай сістэмы нацыянальнай культуры і адукацыі. Перш за ўсё гэта тычыцца педагагічнай дзейнасці і рэальных вынікаў выхавання, суаднесеных з патрэбамі і ідэаламі педагагічнай дзейнасці іншых этнасаў, а таксама з агульначалавечымі патрэбамі, ідэаламі і ацэнкамі. Пытанне этнакультурнага выхавання разглядаюць у сваіх навуковых працах З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева, В.М. Шарая, Р.М. Кавалёва, Т.А. Пладунова [6], Э.В.Шчадрына, Г.А.Барташэвіч [1], Т.І. Кухаронак [4].

Беларускі каляндарна-абрадавы фальклор уключае ў сябе сацыяльныя стасункі, міжгендэрныя і сямейныя зносіны, правілы этыкету і шмат іншага. Асаблівым патэнцыялам валодае сямейна-абрадавая традыцыя як адлюстраванне побыту беларускага народу ва ўсіх яго праявах: у абрадах і звычаях жыццевага цыклу, у працоўнай дзейнасці, сямейных і грамадскіх узаемаадносінах людзей, іх вераваннях, інтарэсах. Менавіта сямейна-абрадавая традыцыя змяшчае творы фальклорнага дзяцінства (пацешкі, калыханкі, лічылкі, дражнілкі, гульні, карагоды), якія з`яўляюцца школай маральнага, эстэтычнага выхавання, псіхафізічнага развіцця чалавека, фактарам уключэння яго ў соцыум. Танцавальна-гульнёвыя традыцыі спрыяюць знаёмству хлопцаў і дзяўчат, засваенню правілаў зносін, узаемнай павагі, што знаходзіць адлюстраванне ў абрадавых і прымеркаваных па часе і абставінах гульнях моладзі (“Яшчар”, “Бахар”, “Жаніцьба Цярэшкі”, “Халімон”, “Падушачка”, “Цяцерка”, “Баяры” і інш.).

На вывучэнне традыцыйнай культуры накіравана дзейнасць фальклорнага ансамбля “Млынок” (кіраўнік Мардань Дар‘я Анатольеўна) Цэнтра дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Маяк” г. Мінска. На занятках ансамбля выкарыстоўваюцца матэрыялы экспедыцый, запісы этнографаў і

этнамузыколагаў, што садзейнічае знаёмству навучэнцаў калектыву з унікальнымі песнямі, танцамі. Выхаванне навучэнцаў фальклорнага ансамбля сродкамі народнай культуры вядзецца ў навучальным і выхаваўчым напрамках дзейнасці. На занятках выкарыстоўваецца практычны матэрыял (відэа- і фотаматэрыялы пра беларускі народны касцюм, беларускія народныя танцы, песні, музычныя інструменты, святы, прыказкі і прымаўкі, загадкі, гульні, апісанне святаў і традыцый.).

Другой формай работы з навучэнцамі з`яўляецца абавязковы *аналіз педагагічных сітуацый з выкарыстаннем метадаў народнай педагогікі* (выхаваўчыя моманты абрадаў, песень, танцаў (гендэрныя адносіны) і г.д.). Рэпертуар фальклорнага ансамбля “Млынок” складаецца ў асноўным з беларускага музычнага фальклору народнага календара і сямейна-абарадавай дзейнасці як пластоў этнічнай культуры, якія змяшчаюць найбольш яскравы і сістэматызаваны педагагічны вопыт. Навучэнцы ансамбля вывучаюць цыкл абрадавых песень “Каляды”, “Гуканне вясны”, “Масленіца”, “Вялікдзень”, “Купалле”, “Жніво”, пазаабрадавыя песні. На прыкладзе мастацкіх узораў фальклору з навучэнцамі разглядаюцца такія складнікі сямейных каштоўнасцей, як дапамога ў працы (Жніво, Багач), сацыяльныя стасункі (Каляды, Вялікдзень – абыходы дамоў), павага да дарослых, усяго роду (Каляды, Дзяды) і г.д. У выхаваўчым працэсе прымаюць удзел бацькі навучэнцаў, якія дапамагаюць развучваць тэксты песень, даведацца пра гісторыю беларускіх абрадаў і святаў, прымаюць актыўны ўдзел у мерапрыемствах. Удзельнікі фальклорнага ансамбля “Млынок” арганізуюць разам з кіраўнікам і бацькамі правядзенне народных святаў, абрадаў, гульняў, гарадскіх майстар-класаў, у тым ліку і ў канікулярны перыяд, што практычна замацоўвае сямейныя каштоўнасці праз народную культуру. У канцэртнай праграме заўсёды прысутнічаюць народныя гульні “Явар”, “Казел”, “Журавель”, “Цяцерка” і побытавыя танцы “Ойра”, “Картузэ”, “Базар”, “Какетка”. Гэта садзейнічае станаўленню пэўных адносін да народнага

мастацтва беларусаў, народнай музыкі, народнага тэатру, вусна-паэтычнай народнай творчасці.

Рэалізацыя этнакультурнага выхавання ўдзельнікаў фальклорнага ансамбля адбываецца па трох структурных накірунках: *народазнаўства, краязнаўства, народнае мастацтва (музычнае і харэаграфічнае). Народазнаўства і народнае мастацтва* ўключаюць спасціжэнне навучэнцамі роднай мовы, народнага календара [2]; быта беларусаў і пэўнага ладу іх жыцця; авалодванне народнымі звычаямі, абрадамі, традыцыямі, народным этыкетам. Беларуская мова з’яўляецца вызначальным элементам фарміравання асобы навучэнца як прадстаўніка пэўнага этнасу, спрыяе этнакультурнаму выхаванню. Разам з засваеннем мовы вядзецца работа па засваенні духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей этнічнай культуры. Гэтаму спрыяе вывучэнне этнічнай гісторыі, асаблівасцей фарміравання беларускага народа, разумення ролі беларускага народа ў гістарычным развіцці чалавецтва. *Краязнаўства* спрыяе фарміраванню ў навучэнцаў пэўных уяўленняў аб прыродзе Беларусі, помніках культуры і архітэктуры; іх актыўнаму ўдзелу ў культуратворчай дзейнасці.

Такім чынам, этнакультурнае выхванне на сучасным этапе – адна з галоўных задач дадатковай адукацыі, таму ставіцца трэба да гэтай тэмы вельмі адказна і прафесійна, бо менавіта ад педагога залежыць дакладнасць і глыбіня перададзеных ведаў. Нацыянальныя традыцыі адлюстроўваюць прыметы этнічных асаблівасцей, гісторыю народа, з дапамогай якіх чалавек суадносіць сябе з пэўным этнасам. Выхаваўчая роля сямейна-родавых традыцый заключаецца ў фарміраванні ў дзяцей і моладзі пачуццяў любові і павагі да сваіх бацькоў (свайго роду), сямейных каштоўнасцей, значнасці гісторыі і культуры каранёвага этнасу Беларусі, бесперапыннасці быцця ў пакаленнях, гуманнага стаўлення да чалавека як часткі сусвету.

## Спіс літаратуры:

1. Барташэвіч, Г.А. Этнакультурныя традыцыі ў сучаснай сістэме выхавання / Г.А. Барташэвіч, У.Д. Каліноўскі // Кіраванне ў адукацыі. – 2012. – №10. – с.10-14.

2. Беларускі народны каляндар / аўтар-уклад. А.Лозка. – Мн.: Полымя, 1993.– 205с.

3. Кухаронак, Т.І. Роля традыцыйнай культуры беларусаў у сучасным выхаваўчым працэсе / Т.І. Кухаронак // Народная спадчына Бацькаўшчыны: вывучэнне спадчыны і выхаванне дзяцей сродкамі аўтэнтычнага народнага мастацтва: Матэрыялы фальклорных чытанняў / Т.І. Кухаронак. – Мн., выд.”Чатыры чвэрці”, 2002. – с. 54-59.

4. Можейко З.Я. Экология традиционной народно-музыкальной культуры: нематериальная культура Беларуси в свете социально-экологических проблем. – Минск: Беларус. навука, 2011. – 147 с.

5. Пладунова, Т.А. Фальклор як экасістэма культуры (Да пытання этнакультурнага выхавання дзяцей і моладзі) / Т.А. Пладунова // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання і пераемнасці: зборнік матэрыялаў навукова-практычнай канферэнцыі / Т.А. Пладунова. – Мазыр: МазДПі імя Н.К. Крупскай, 2001. – С.3-6.

6. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т.1. Магілёўскае Падняпроўе / Т. Б. Варфаламеева, В. І. Басько, М. А. Козенка і інш. — Мн.: Бел. Навука, 2001. — 797 с.

*Дадатак 1*

## Сцэнар выхаваўчага мерапрыемства "Прыйшла Каляда ўвечары!"

***Вядучая –*** Мардань Дар'я

***Удзельнікі мерапрыемства:*** *фальклорны калектыў "Млынок", гледачы*

*Сцэна абсталявана пад вясковую хату*
*Печ, лаўкі, па-святочнаму засланы стол.*
*У хаце – гаспадыня, дзеці*

***Вядучая***: Святы Каляды, Новы год і Вадохрышча вядомы ў беларусаў пад назвай **"Каляды"**. Пярэдадзень гэтых святаў носіць агульную назву "куцця" – па назве традыцыйнай стравы. Каляды святкавалі з 24 снежня па 6 студзеня (па старым стылі), зараз яны адзначаюцца з 7 па 19 студзеня. *Назва іх паходзіць ад лацінскага слова "календы". Так старажытныя рымляне называлі першы дзень кожнага месяца. Усе календы святкаваліся, але асабліва ўрачыста адзначалі навагоднія. Назва "каляды", засвоеная славянскімі і неславянскімі народамі Еўропы, мае свае варыянты: у рускіх і ўкраінцаў – "коляды", у балгар – "коледуванне", у сербаў і харватаў – "коледа" і г.д.* Каляды заўсёды былі вельмі папулярнымі ў моладзі, менавіта яна больш за ўсіх удзельнічала ў разнастайных забавах, гульнях, танцах. Хлопцы і дзяўчаты аб'ядноўваліся ў групы па 5-15 чалавек і пераапраналіся ў розныя маскарадныя касцюмы. Былі "каза", "конь", "бусел", "мядзведзь". Часам кампанію ўзначальваў "павадыр" – стары сівы дзядок, які вадзіў на павадку "казу". Таксама ў кампаніі калядоўшчыкаў былі музыкі, запявала, механоша (той, хто насіў мех для пачастункаў) і "цыган". Усе апраналіся ў вывернутыя кажухі, "цыганы" вымазвалі твар сажай, павязвалі каляровыя хусткі.

Калядаванне пачыналася на другі дзень. Калядоўшчыкі збіраліся з надыходам цемры і з песнямі абыходзілі па чарзе ўсе хаты. Яны заходзілі ў двор і пачыналі спяваць віншавальныя, хвалебныя песні гаспадару, гаспадыні і іх дзецям, жадаючы ўсяго найлепшага. Кожная сям'я чакала гэтага моманту, таму гаспадар хутка выходзіў на ганак і запрашаў гасцей у дом, дзе разгортвалася сапраўдная тэатральная імпрэза. Галоўнай гераіняй была "каза". У старажытнай славянскай міфалогіі яна лічылася сімвалам урадлівасці і дабрабыту сям'і. Яна кідалася то на калядоўшчыкаў, то на гаспадароў, "бадала" дзяцей. А потым раптоўна заціхала і падала на падлогу. Калядоўшчыкі кідаліся да казы, спрабавалі "ажывіць" яе. Але нічога не выходзіла. І тады нехта пачынаў песню: "Ой, пан ідзе, Каляду нясе, тры кускі сала, каб каза ўстала". Пачуўшы гэта, гаспадыня ішла ў каморку і выносіла калядоўшчыкам пачастункі. Убачыўшы іх, каза "ажывала". Госці з развітальнай песняй пакідалі хату.

Сёння ўдзельнікі фальклорнага калектыву “Млынок” пад маім кіраўніцтвам праспяваюць для вас калядныя песні, адну з якіх (“Го-го-го, каза”) мы вывучым разам з вамі, ды прадэманструюць частку абавязковага каляднага абраду “Ваджэнне казы”.

***Калядоўшчыкі:***

– Добры вечар, шчодры! Загадайце калядаваці!
– Каму?
– Гаспадару!

*Ці дома, дома сам пан-гаспадар?*
*Добры вячор,багаты вячор!*
*А калі дома – выйдзі, паслухай*
*Добры вячор, багаты вячор!*
*Выйдзі, паслухай, што ў бары гудзе,*
*Што ў бары гудзе – пчолка-матка йдзе,*
*Пчолка-матка йдзе і райкі вядзе.*

***Калядоўшчыкі***

– Мы ж да вас не самі ідзем, мы з сабой казу вядзем – шэру, валахату, ад адной хаты да другой хаты! Дазвольце ж нашай казе паскакаці, вашу хату ўзвесяляці! (песня “Го-го-го, каза”для развучвання з педагогамі).

*Го-го-го, каза!*
*Го-го-го, шэра́!*
*Ты хадзі, каза,*
*У чыстае поле́.*

*У чысты́м поле́*
*Там жыта расце.*
*Дзе каза хадзі́ць,*
*Там жыта родзі́ць.*

*Дзе каза топ-топ,*
*Там жыта́ сем коп.*
*Дзе каза рагом,*
*Там жыта́ стагом.*
*Го-го-го, каза,*
*Го-го-го, шэра,*
*Не хадзі, каза,*
*Укругом сяла.*

*Укругом сяла*
*Гарныя стральцы.*

*Радзяцца ідці*
*Козаньку біці.*
*Козаньку біці,*
*Шкурку злупіці,*
*Шкурку злупіці,*
*Шубку пашыці.*

*Го-го-го, каза!*
*Го-го-го, шэра́!*
*Пакланісь, каза,*
*Хазяіну ў ногі́.*
*Шчэ й гаспадыні,*
*Шчоб адорылі.*

***Калядоўшчыкі:***
– Ой! Каза упала! Сдохла, прапала! Дайце казе сала, каб каза устала! Вялікі піrог, каб козы сцярог! І гладыш малака, каб каза расла! І жбаночак мёду, нам на асалоду! *(каза ўстае, карагод працягваецца)*

*Го-го-го, каза!*
*Го-го-го, шэра!*
*Пакланісь, каза,*
*Хазяіну ў ногі.*
*Шчэ й гаспадыні*
*Шубку ўдарылі.*

***Вядучая:*** З Новым годам, і усім родам! З усімі святкамі-калядкамі! І з Раством Хрыстовым!

*Прыйшла Каляда ўвечары,*
*Прынясла пірагі ў рэшаце.*
*Паставіла пірагі на стаўпе,*
*Сама села Каляда й у куце.*
*А малыя дзеці – за пірог.*
*Пайшла Каляда за парог.*

***Вядучая:*** Таксама на Каляды ладзілі гульні ды танцы. Запрашаем вас патанчыць! *(развучванне танцаў “Падэспань”, “Юрачка”).*

*Дадатак 2*

**Фотаздымкі, афішы з мерапрыемстваў**



*Канцэрт “Прыйшла Каляда”, КМЖ “Равеснік”, снежань 2022*



*Беларускі дзяржыўны акадэмічны тэатр юнага гледача, творчая праграма, снежань 2023*



*Майстар-клас у Рэспубліканскай гімназіі-каледжы пры акадэміі музыкі, люты 2024 (народныя гульні, танцы)*






*Афіша Дзяржаўнага музея гісторыі беларускай літаратуры, філіял Беларуская хатка*



*Афіша выступу ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі імя Якуба Коласа*



*Выступ ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі імя Якуба Коласа*


Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры
Філіял "Беларуская хатка"
Фальклорны ансамбль 'Млынок''
(кіраўнік Мардань Дар'я Анатольеўна)
прадстаўляе святочную імпрэзу
«А ў нас сёння Масленка!»
Далучайцеся
24 лютага а 14 гадзіне
ў Беларускай хатцы!
Адрас, вуліца Рабкораўская 19